Бібліятэка навукова-пазнавальнай літаратуры

# ЭЎРЫКІ





**САПРАЎДНАЯ НАВУКА НЕ ВЕДАЕ НІ СІМПАТЫЙ, НІ АНТЫПАТЫЙ, АДЗІНАЯ МЭТА ЯЕ — ІСЦІНА.**

Бібліятэка навукова-пазнавальнай літаратуры

# Эўрыка

Нарысы



Мінск «Юнацтва» 1993

ББК 72
Э 93
УДК 087.5:001

Серыя заснавана ў 1988 годзе

Укладальнік Н. В. ФІЛІПОВІЧ

Мастак У. Ц. АКАРСКІ

Для дзяцей малодшага школьнага ўзросту

Э $\frac{4802000000-020}{М 307(03)-93}$ 22—93

ISBN 5-7880-0663-5

© Укладанне.
Н. В. Філіповіч, 1993
Афармленне. У. Ц. Акарскі, 1993



# СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ

*Міхась Чарняўскі, археолаг*

## Неўры, гуты, балты, славяне

Чалавек нараджаецца і памірае. Адыходзяць, знікаюць пакаленні. Ды што пакаленні, бывае — і цэлыя народы... Але не бясследна. На зямлі, у гэтай вялікай кнізе Жыцця, застаюцца знакі — сляды дзейнасці іх працавітых рук. Глядзіш, недзе на ўскрайку поля ледзь праступае каляінамі старая дарога. І ніхто ўжо не памятае, калі па ёй ездзілі. Або вось на сухім грудзе ўдзірванелыя межы, а побач між кустоў шыпшыны ледзь праступае падмурак зруйнаванай калісь бажніцы. Нават у лясных нетрах можна натрапіць на заімшэлы роў — траншэю даўняй ці пазнейшай вайны. Ёсць і старажытнейшыя сляды людскога існавання — гарадзішчы, курганы, селішчы... Гэта «нямыя сведкі» чалавечай гісторыі, падзей даўніх, далетапісных. Але яны «нямыя» толькі да пары,

пакуль іх вывучэннем не зоймсцца археолаг. Тады яны «загаворацЬ» і шмат чаго раскажуць пра сівую мінуўшчыну.

Археалагічныя раскопкі засведчылі, што чалавек упершыню трапіў на тэрыторыю Беларусі больш як 50 тысячагоддзяў назад, у старажытным каменным веку. Каменны век — найбольш працяглы перыяд нашай мінуўшчыны, і скончыўся ён чатыры тысячагоддзі назад. І фактычна толькі ў яго канцы пачалі адчувацца больш прыкметныя зрухі ў развіцці грамадства — зарадзіліся земляробства і жывёлагадоўля. У бронзавым веку, які на Беларусі пачаўся на мяжы 3-га і 2-га тысячагоддзяў да н. э., людзі пазнаёміліся з першымі вырабамі з медзі і бронзы. Аднак і ў бронзавым веку працягвалі дамініраваць ранейшыя традыцыі веку каменнага. І толькі калі нашы продкі авалодалі жалезаробствам, развіццё чалавечай матэрыяльнай і духоўнай культуры пачало прыкметна паскарацца.

На землях Беларусі бронзавы век змяніўся жалезным у 7—6 стагоддзях да нашай эры, калі пачалася здабыча жалеза з балотнай руды. Такая сыравіна распаўсюджана ў многіх месцах, таму і жалеза атрымоўвалі шмат. І яго хапала для вырабу самых розных рэчаў — сякер, сярпоў, нажоў, наканечнікаў коп'яў і стрэлаў, рыбалоўных кручкоў і восцяў, шылаў, паясных спражак, запінак для вопраткі і шмат чаго іншага. Да таго ж прадукцыйнасць металічных прыладаў працы была значна большая, чым каменных і нават бронзавых, таму ў новую эпоху камень амаль поўнасцю быў выцеснены з ужытку, а медзь і бронза сталі выкарыстоўвацца пераважна толькі для ўпрыгожанняў.

Посуд (кераміка) жалезнага веку, як і ў папярэднія часы, ляпіўся з гліны рукамі. Карысталіся амаль выключна пласкадоннымі гаршкамі, рознымі кубкамі, міскамі, збанамі. Іх пласкадоннасць сведчыць пра тое, што ў інтэр'еры тагачаснага жытла былі агнішчы з роўным чэранем, дашчаныя сталы, паліцы. Гліняныя вырабы страцілі багатую арнаментацыю, характэрную для бронзавага веку, а большасць іх увогуле не мела ўзораў. У гэты час, мяркуючы па знаходках праселак ад верацёнаў і



ткацкіх станкоў, было распаўсюджана прадзенне і ткацтва, і людзі насілі палатняную вопратку.

Вострай жалезнай сякерай можна было ссекчы тоўстае дрэва, нашчапаць дошак, вычасаць моцную драўляную рыдлёўку. Таму і чалавечае жытло ў жалезным веку стала больш надзейнае і даўгавечнае. На поўдні Беларусі пераважалі паўзямлянкі, больш на поўнач тубыльцы жылі амаль выключна ў наземных хацінах слупнай канструкцыі. Пазней паўзямлянкі распаўсюджваюцца і на іншыя рэгіёны Беларусі, паяўляюцца зрубныя жытлы. Некалькі жылых і гаспадарчых збудаванняў утваралі паселішчы. Тыя, што неўмацаваныя, археолагі называюць селішчамі, а ўмацаваныя — гарадзішчамі. На значнай частцы басейнаў Прыпяці і Дняпра існавалі як селішчы, так і гарадзішчы, у цэнтральнай і паўночнай Беларусі — пераважна гарадзішчы. Гарадзішчы ладзіліся на высокіх берагавых мысах, на стромкіх пагорках. Каб зрабіць іх больш недаступнымі, навокал паселішчаў капалі глыбокія равы, насыпалі валы, ставілі паркан або сцены з бярвення. Часам было па некалькі равоў і валоў, што стварала эшаланіраваную абарону. Усярэдзіне гэтых земляных замкаў знаходзіліся, як правіла, роўныя



пляцоўкі, забудаваныя па краях, з загонамі для жывёлы. Часам забудоўвалася ўся тэрыторыя гарадзішча.

Тагачасныя людзі хаваліся са сваімі пажыткамі, плёнам жывёлагадоўлі і земляробства за ўмацаваннямі. Справа ў тым, што новыя, прагрэсіўныя формы гаспадарання, якія ўсё больш выцяснялі спрадвечныя паляванне, рыбалоўства і збіральніцтва, вялі да накаплення ў асобных родах багаццяў. Таму стала прыбытковым не толькі стваральная праца, але і ўзброенае грабежніцтва суседзяў. Пры адсутнасці сістэмы калектыўнай абароны, без дзяржаўнай арганізаванасці кожны чалавечы калектыў спадзяваўся толькі на ўласныя сілы, на ўмацаванні гарадзішча.

Развіццё ворнага земляробства і жывёлагадоўлі — заняткаў пераважна мужчынскіх — прывяло да прыкметнага росту аўтарытэту мужчыны — бацькі ў сям'і і родзе, які імкнуўся перадаць сваю маёмасць у спадчыну сынам. Так яшчэ ў бронзавым веку пачаў фарміравацца патрыярхальны родавы лад, які свайго росквіту дасягнуў у раннім жалезным веку. Таксама яшчэ ў папярэднюю эпоху на Беларусі распаўсюдзіліся рэлігійныя вераванні, звязаныя з земляробчымі культамі, з абагаўленнем нябесных свяцілаў, жыватворнай моцы агню.

Даследчыкамі было заўважана, што ў асобных вялікіх рэгіёнах канцэнтруюцца помнікі — гарадзішчы, селішчы, могільнікі, блізкія між сабою па тыпах жытлаў, характару пахаванняў, па прыладах працы, кераміцы, упрыгожаннях. Гэта дазваляла выяўленыя старажытнасці аб'ядноўваць у археалагічныя культуры. Лічыцца, што такія культуры адпавядаюць плямёнам, што размаўлялі на адной мове або блізкіх дыялектах. Вось у жалезным веку нашы землі і засялялі плямёны розных археалагічных культур. Напачатку на паўднёвым усходзе Беларусі гэта было насельніцтва мілаградскай культуры (названа так па характэрнаму гарадзішчу каля вёскі Мілаграды Рэчыцкага раёна). Яно першым пачало будаваць гарадзішчы, ляпіла і ўжывала арыгінальны кругладонны посуд, а таксама рагатыя гліняныя праселкі з каляндарнымі знакамі на некаторых з іх, статуэткі жывёл. У 3-м стагоддзі да н. э. мілаградскую культуру



змяніла зарубінецкая (названа па характэрнаму могільніку каля вёскі Зарубінцы на Кіеўшчыне).

Зарубінцы жылі пераважна на гарадзішчах сваіх папярэднікаў, абнавіўшы іх умацаванні. Яны мелі шмат жалезных вырабаў, бронзавых і шкляных упрыгожанняў, карысталіся ляпным і глянцаваным пласкадонным посудам. Аб этнічнай прыналежнасці мілаградцаў вучоныя часта спрачаюцца. Іх лічаць то старажытнымі балтамі (продкамі сённяшніх латышоў і літоўцаў), то славянамі, то прадстаўнікамі нейкага невядомага этнасу. Зарубінцаў большасць даследчыкаў лічыць ужо славянамоўнымі. Прыкладна аднучасова з мілаградцамі крайні паўднёвы захад Беларусі займала насельніцтва паморскай культуры, для якога характэрны селішчы з паўзямлянкамі і наземнымі жытламі, разнастайны посуд з заглянцаванай і няроўнай паверхняй. Этнічная прыналежнасць паморцаў канчаткова не вызначана.

З самага пачатку жалезнага веку і да сярэдзіны першага тысячагоддзя нашай эры шырокія прасторы цэнтральнай Беларусі засялялі плямёны культуры штрыхаванай керамікі. Сама назва культуры паказвае, што яе носьбіты мелі вельмі характэрны посуд з выразна за-



штрыхаванымі паверхнямі. На гарадзішчах штрыхавікі жылі ў доўгіх наземных жытлах слупнай канструкцыі. На паўночным усходзе ад гэтага насельніцтва знаходзілася тэрыторыя плямёнаў днепрадзвінскай культуры. Гэтая культура блізкая да культуры штрыхаванай керамікі і мае найбольш істотнае адрозненне — гладкасценны посуд. Аб'ядноўвае іх і адсутнасць пахаванняў. Тагачасныя жыхары цэнтральнай Беларусі, басейна Дзвіны і Верхняга Дняпра трымаліся нейкіх пахавальных абрадаў, якія не захоўвалі рэшткаў цела нябожчыка. Носьбітаў абедзвюх культур большасць даследчыкаў залічвае да старажытных балтаў, а на самай поўначы беларускага Падзвіння адчуваўся ўплыў і фіна-угорскага насельніцтва.

Старадаўнія жыхары Беларусі, нягледзячы на бясконцыя пушчы і палескую дрыгву, не былі ізаляваныя ад блізкіх і нават далёкіх земляў. На поўдзень ад іх знаходзіліся неспакойныя скіфы, якія аказвалі ўплыў на насельніцтва Падняпроўя і берагоў Прыпяці, і не заўсёды мірным шляхам, пра што сведчаць знаходкі наканечнікаў скіфскіх стрэлаў на некаторых тутэйшых гарадзішчах. Мела яно разнастайныя кантакты і з кельтамі



Цэнтральнай Еўропы, антычнымі гарадамі Прычарнамор'я, ускраіннымі землямі Рымскай імперыі. Праз Беларусь з Прыбалтыкі ў Міжземнамор'е вёў адзін з бурштынавых шляхоў.

Нашы продкі ў жалезным веку абыходзіліся без пісьменнасці, таму яны не захавалі нам сваёй палітычнай гісторыі і нават саманазовы. Але вось грэкі яшчэ ў 5-м стагоддзі да н. э. ведалі, што на поўнач ад скіфаў жыў народ неўры, з якімі звязаны паданні аб змеях і ваўках — пярэваратнях. Змяіныя культы сярод беларусаў захоўваліся да самага апошняга часу, як і вера ў ваўкалакаў, да таго ж там-сям на Беларусі і сёння маюцца вёскі з назвамі Наўры, наўране. Таму не выключана, што менавіта неўрамі — наўрамі і называліся тагачасныя жыхары дзесьці на поўначы Прыпяці. Некаторыя даследчыкі лічаць неўрамі носьбітаў мілаградскай культуры. Тыя ж грэкі лічылі, што побач з неўрамі жыло іншае племя — андрафагі (пажыральнікі людзей). З імі часам звязваюць насельніцтва культуры штрыхаванай керамікі або днепра-дзвінскай. Калі гэта і сапраўды так, то нас не павінна бянтэжыць, што нашы продкі на нейкай тэрыторыі і ў нейкі час, магчыма, былі людаедамі. Праз рытуальны канібалізм прайшлі многія першабытныя народы, а можа, і ўсе. Пра гэта сведчаць і этнаграфія і археалогія.

Ведаем мы назву і яшчэ аднаго племя, якое, хоць і нядоўга, жыло на паўднёвым захадзе Беларусі. Гэта былі германцы готы, або, як яны сябе часцей называлі, гуты, што ў 2-м і 3-м стагоддзях нашай эры рухаліся з берагоў суровай Балтыкі на цёплае і ўрадлівае Прычарнамор'е. Пэўны час яны затрымаліся на сучаснай Брэстчыне, адкуль рабілі рабаўнічыя паходы на суседнія землі, у тым ліку і на Панямонне, заселенае балтамі. І так даліся ім у знакі, што, мабыць, па гэтай прычыне літоўцы яшчэ і сёння славян-беларусаў, што жывуць на поўдзень ад іх, называюць гудамі, а Беларусь — Гудзіяй.

Калі аб славянскасці носьбітаў паўднёвабеларускіх культур ранняга жалезнага веку вучоныя яшчэ часам спрачаюцца, то ў 6-м стагоддзі нашай эры на Прыпяці

ўжо існавалі несумненныя славянскія паселішчы. Зрушаныя вялікім перасяленнем народаў, славяне ў гэты час пачынаюць асабліва энергічную экспансію, займаючы разлеглыя прасторы Еўропы да ўсходняй Германіі на захадзе, узбярэжжа Балтыйскага мора на поўначы, да Адрыятыкі на поўдні. Пачынаюць яны накіроўвацца і на Беларускае Падняпроўе, на спрадвечна балцкія тэрыторыі. Аб гэтым пэўным чынам сведчаць і сляды пажараў у верхніх пластах многіх тутэйшых гарадзішчаў. У выніку на большай частцы Беларусі ўтварылася своеасаблівая археалагічная культура, якую называюць Банцараўскай па найменню гарадзішча пад Мінскам. Для яе характэрна перавага яшчэ балцкіх элементаў, аднак прыкметныя і славянскія рысы. Значыць, носьбіты культуры былі двухэтнічныя, балта-славянскія. Але ж беларусы — гэта ў значнай ступені аславяненыя балты. Такім чынам, яшчэ паўтара тысячагоддзя назад на нашых землях ствараліся ўмовы для фармавання старабеларускага этнасу.

Для банцараўскай культуры тыпова і тое, што яе носьбіты перайшлі жыць з гарадзішчаў на адкрытыя селішчы, свае ранейшыя земляныя ўмацаванні выкарыстоўваючы толькі як сховішчы пры небяспецы. Значыць, сярод тутэйшых плямёнаў была ўжо арганізавана калектыўная абарона, якую магла здзяйсняць пэўная дзяржаўная ўлада. Аб існаванні нейкіх формаў дaлетапіснай дзяржаўнасці на Беларусі таксама сведчаць знаходкі надзвычай багатых убораў чалавека і каня, дарагіх рэчаў, якія належалі асобам, што займалі выключнае становішча сярод супляменнікаў, шпоры воінаў-вяршнікаў, старыя гарадзішчы — замкі, дзе сустракаецца шмат зброі, верагодна, дружыннікаў першых князёў. Трэба адзначыць таксама, што тэрмін князь (правадыр, правіцель) вядомы ўсім славянскім мовам, значыць, ён існаваў яшчэ ў час іх адзінства, задоўга да сярэдзіны 1-га тысячагоддзя нашай эры. Акрамя таго, агульнавядома, што тагачасныя і больш раннія германскія плямёны, тыя ж гуты, мелі свае дзяржаўныя ўтварэнні. Славяне былі прыкладна на такім жа ўзроўні гаспадарчага і сацыяльнага развіцця. Таму і ў іх існавалі аналагічныя ўмовы дзяржаватворчасці.

Гіпатэтычная «Банцараўская дзяржава» праіснавала нядоўга. Праз пару стагоддзяў на тэрыторыю Беларусі пранікае новая хваля славянскіх перасяленняў, на гэты раз летапісных плямёнаў крывічоў, радзімічаў, дрыгавічоў.







# ІНШАПЛАНЕЦЯНЕ

*Дзмітрый Новікаў, журналіст*

## НЛА у Беларусі

Восенню 1986 года ваколіцы вёскі Амневічы Карэліцкага раёна сталі аб'ектамі пільнай увагі міліцыі. Дзве ночы тут дзяжурылі міліцэйскія пасты. Потым з'явілася вялікая група людзей, якія старанна прачэсвалі палі і пералескі. Ва ўсім адчувалася строгая таямнічасць... Дык што ж здарылася каля вёскі Амневічы?

Толькі праз тры гады жыхары вёскі Амневічы Вера Бокша і яе дачка Ніна напісалі ліст у мінскую групу па вывучэнню анамальных з'яў. У ім яны паведамлялі, што з 27 верасня па 3 лістапада 1986 года назіралі ў ваколіцах свайго населенага пункта палёты неапазнанага лятаючага аб'екта (НЛА), які ператвараўся з прадаўгаватай «зоркі», быццам злепленай з трох частак (белай, жоўтай і аранжавай), у блакітны шар. Бокшы таксама сцвярджалі, што бачылі «пасадку» гэтай канструкцыі.



Тады, у 1986 годзе, Бокшы пазванілі ў міліцыю, каб яна неадкладна прыбыла на месца здарэння. Неўзабаве Алег Рында, які працаваў у той час участковым, сказаў Веры Бокшы, што незвычайны лятальны апарат удалося «высачыць». І папярэдзіў, каб яны з дачкой нікому не гаварылі аб «візіцёрах». Жанчыны і маўчалі...

Калі члены мінскай групы па вывучэнню анамальных з'яў і аўтар гэтых радкоў завялі з Рындам гутарку на гэту тэму, ён наадрэз адмовіўся прызнаць нават сам факт размовы з Бокшай. Іншыя ўдзельнікі аперацыі «Прышэльцы» таксама сцвярджалі, што нічога звышнатуральнага не бачылі, а сваю ўвагу да заявы вяскоўцаў тлумачылі звычайнай чалавечай цікаўнасцю.

Між тым спецыялісты, грунтуючыся на аналізе фактаў і абставін, пацвердзілі: Бокшы сапраўды назіралі НЛА...

Дык што ж такое НЛА? Я зацікавіўся гэтым пытаннем шмат гадоў назад. Тады, у пачатку 70-х, на экранах краіны з вялікім поспехам дэманстравалася кінастужка заходнегерманскага даследчыка Дэнікена «Успамін аб будучыні». Аўтар праводзіў у ёй думку, што ў старажытныя часы нашу планету (рэгулярна) наведвалі іншапланецяне, аказваючы істотны ўплыў на развіццё цывілізацый, і аргументаваў сваю гіпотэзу даволі пераканаўчымі доказамі.

Пасля дэнікенаўскага фільма я пачаў задумвацца над узаемасувязямі касмічнай неабсяжнасці і Зямлі, тымі відавочнымі і скрытымі сувязямі, якія знітаўваюць чалавека і Сусвет. А яшчэ пачаў збіраць усё, на маю думку, найбольш цікавае пра космас і анамальныя з'явы. Мяркую, сёе-тое з таго, што захоўваецца ў маіх журналісцкіх папках, запісах у блакнотах і на магнітафонных стужках, а то і проста ў памяці, будзе цікавым для чытачоў.

Тэрмін НЛА упершыню быў ужыты пасля таго, як 24 чэрвеня 1947 года амерыканскі пілот Кенет Арнольд, пралятаючы на самалёце над тэрыторыяй штата Вашынг-

тон, заўважыў у паветры дзевяць незвычайных дыскаў (адсюль «лятаючыя талеркі»), якія рухаліся. Паведамленні аб гэтым у розных інтэрпрэтацыях з'явіліся ў прэсе, і вакол НЛА усчаўся сапраўдны бум.

Безумоўна, такое назіралася і раней. З глыбокай старажытнасці вядомыя выпадкі, якія звычайна напрамую звязвалі з праявамі «боскай» або «нячыстай» сілы. Аднак толькі з 1947 года пачалося сістэмнае вывучэнне фенамена.

Паводле падлікаў спецыялістаў, колькасць сведчанняў аб НЛА перавысіла сёння 100 тысяч, такія аб'екты бачылі больш за 100 мільёнаў чалавек. Шмат выпадкаў падрабязна апісаны. Толькі ў ААН захоўваецца больш за 70 тысяч фотаздымкаў і каля 120 дакументальных кінасюжэтаў, звязаных з імі.

У нашай краіне неапазнаныя лятаючыя аб'екты з'яўляліся і з'яўляюцца ў самых розных месцах — ад Калінінграда да Уладзівастока і ад Паўночнага Ледавітага акіяна да Паміра. Апошнім часам такіх выпадкаў асабліва многа. Але, нягледзячы на такі багаты «ураджай» НЛА, было б памылкай думаць, што апошнія гады ў гэтым плане нейкія унікальныя. Паводле сведчання вядомага маскоўскага ўфолага У. Ажажы, такія «нашэсці»



былі ўжо ў нашай краіне ў 1966—1967, 1977—1979 гадах. Іншая справа, што тады пра іх вельмі мала гаварылі і яшчэ менш пісалі.

Першае «афіцыйна зарэгістраванае» паведамленне аб НЛА датавана летам 1908 года. Тады сярод белага дня неба над Мінскам як бы раскалолася на дзве часткі, у разломе з'явіўся «страшны агонь», які рухаўся з неверагоднай хуткасцю. Усчалася паніка. Людзі падумалі, што надышоў «канец свету».

У апошнія 10—15 гадоў НЛА з'яўляюцца на Беларусі даволі часта. Вось толькі некалькі вытрымак, якія захоўваюцца ў асабістым архіве аўтара.

1976 год. Канец жніўня — пачатак верасня. Паміж 23 і 24 гадзінамі над Гомельскім гарадскім паркам вялікая група адпачываючых бачыла дзіўную з'яву. У небе пралятала шарападобнае цела, якое нагадвала зорку. Рухаючыся па прамой лініі, яно раптам зрабіла паварот на 90 градусаў і працягвала палёт да наступнага вугла ўяўнага квадрата. На другім «вітку» квадрат стаў пашырацца, потым — яшчэ і яшчэ, прычым адлегласць паміж бакамі фігур, якія «малявала» цела, на ўсіх «вітках» была аднолькавая.

1980 год. Верасень. Над Бабруйскам рухаўся прад-



мет, які меў форму расцягнутага каната, каля метра ў дыяметры і больш як кіламетр даўжынёй. Канат нечакана ператварыўся (трансфармацыя, дарэчы, адна з неад'емных уласцівасцей многіх НЛА) у кальцо, затым — у мудрагелістую спіраль, нарэшце — у набор нейкіх лічбаў, што потым «сціснуліся» і, узмыўшы ўверх, зніклі. Усё гэта суправаджалася шэра-блакітным свячэннем.

1983 год. Лета. Яркі белы шар, што праз кожныя пяць секунд «выпускаў» конус «замарожанага» святла, бачылі над некалькімі населенымі пунктамі Брэсцкай вобласці.

1985 год. Канец кастрычніка. А палове пятай гадзіны раніцы над вёскай Жароўка Любанскага раёна з'явіўся блакітны шар. 30 снежня ў 20 гадзін 30 мінут тут жа «спыніўся» аранжавы шар, ад якога зыходзілі промні. Шары трымаліся ў паветры 4—5 мінут, потым бясследна зніклі. Прыкладна ў гэты ж час у ваколіцах вёскі Таль гэтага ж раёна назіралі дыскападобнае цела з вежачкай, якое міргала бледна-блакітнымі агнямі.

1987 год. 23 жніўня. Над возерам Снуды Браслаўскага раёна ўспыхнуў «пражэктар», колер якога мяняўся з белага на чырвоны. 8 верасня ў дзве гадзіны дня яркі вогненны шар паволі рухаўся над адным з мінскіх паркаў. Вакол яго ўтварылася шэраватая дымка. Праз 2—3 мінуты палёту шар нечакана рэзка скіраваўся ўніз і растаў. 30 кастрычніка ў раёне Віцебска на дваццаціметровай вышыні ляцеў жоўты аб'ект, які міргаў, асвятляючы наваколле скіраваным промнем святла.

1988 год. 3 лістапада. Над Брэстам рухаўся НЛА у выглядзе «кліна», які свяціўся.

У 1989 годзе НЛА пайшлі, што называецца, касяком.

...27 сакавіка жыхар вёскі Баражное Столінскага раёна Ю. Кавалевіч а палове адзінаццатай гадзіны вечара выйшаў на ганак сваёй хаты і не паверыў вачам. За 200 метраў ад яго нізка над зямлёй вісеў велізарны вогненна-чырвоны шар. Не паспеў Ю. Кавалевіч апамятацца, як шар рэзка ўзмыў угору і імгненна знік.

...17 верасня жыхар Пінска П. Сахнюк разам са сваім сябрам П. Свавульцам вярталіся з рыбалкі. У 21 гадзіну 40 мінут за іх спіной нечакана запульсавала яркае святло. Калі рыбаловы азірнуліся, то прыкладна за тры кіламетры ад сябе ўбачылі яркі чырвоны шар, што паволі спускаўся на бераг Прыпяці. Калі ён набліжаўся да зямлі, святло слабела. Праз некалькі секунд шар знік, і амаль адразу па наваколлі пранёсся прыглушаны гул, падобны на гудзенне трансфарматарнай будкі.

...20 верасня вучаніца 5 класа СШ № 2 горада Вілейкі Наташа Зяцікава гуляла каля дома. Увагу дзяўчынкі прыцягнуў невялікі круглы прадмет ліловага колеру, які па паветры рухаўся ў яе бок. Неўзабаве ён наблізіўся і завіс над вершалінамі высокай ліпы. Адразу ж бліснуў, нібы ад пражэктара, промень аранжавага колеру. Ён слізгануў па зямлі літаральна за пяць крокаў ад Наташы. Дзяўчынка спалохалася і паспяшалася схавацца ў пад'ездзе. Калі яна праз некаторы час выглянула адтуль, дзіўнага прадмета ўжо не было.

1990 год быў не менш адметным. НЛА па-ранейшаму «атакавалі» рэспубліку. Іх бачылі ў Гродзенскім, Навагрудскім, Дзяржынскім, Крупскім, Гомельскім, Бабруйскім, Слуцкім, Столінскім, Вілейскім, Маладзечанскім, Мінскім, Капыльскім, Смалявіцкім, Мазырскім і іншых раёнах рэспублікі. У самы розны час самых розных памераў і форм.

Дарэчы, аб формах. Уфолагі ЗША некалі склалі спецыяльную табліцу кваліфікацыі неапазнаных лятаючых аб'ектаў. У ёй — больш як 30 тыпаў форм НЛА: ад талерак і шароў — да ромбаў, крыжоў, «цыгарэт» і г. д... Аднак мяркуючы па паведамленнях прэсы апошніх гадоў, іх значна больш. Многія зафіксаваны і ў Беларусі. Аб некаторых я ўжо ўспамінаў. Але ёсць шмат не менш цікавых прыкладаў. Так, 17 мая 1985 года ў 1.00 у Мінску быў сфатаграфаваны НЛА у выглядзе трох скручаных спіраляў і двух косак. У ноч з 5 на 6 верасня таго ж года над вёскай Канюхі Ляхавіцкага раёна рухалася скапленне рознакаляровых кропак, «спрасаваных» у трохкутнік. 15 сакавіка 1989 года над горадам Беразіно ўзнікла мноства чырвона-жоўтых агнёў, якія ўтварылі фігуру, што нагадвала лязо лапаты. «Лязо» трансфарміравалася ў тупы наканечнік стралы, елачку, пяціканцовую зорку, і нарэшце — у талерку з двума вялікі-

мі агнямі па краях. 30 верасня таго ж года над лесам каля вёскі Талька Пухавіцкага раёна завіс светла-серабрысты дыск з патаўшчэннямі на краях. Той жа восенню (лістапад) у Мастах бачылі аб'ект, падобны на аўтобус з двума велізарнымі «вокнамі» і яркай «фарай». У пачатку студзеня 1990 года каля 5 гадзін раніцы над Магілёвам з'явіўся НЛА у выглядзе двух абручоў з пяццю пражэктарамі, які неўзабаве пераўтварыўся ў авальны прадмет таксама з пражэктарамі, што падсвечваў усімі колерамі вясёлкі. Жыхары вёскі Дубянец Столінскага раёна 2 мая сачылі за палётам цела, якое нагадвала перавернуты капялюш.

Аднак, напэўна, самыя унікальныя і неверагодныя формы НЛА пашчасціла назіраць мінчанам, якія жывуць у раёне вуліцы Каліноўскага беларускай сталіцы, вечарам 14 ліпеня 1990 года. Вось што расказала пра тую незвычайную з'яву адна з яе сведак, старшы выкладчык Белдзяржуніверсітэта Г. Кажушкова:

«Была палова восьмай вечара. Я падышла да акна і на заходнім краі неба ўбачыла «слуп», які нагадваў вясёлку, толькі строга вертыкальную, нібы «адрэзаную» з двух бакоў. Асноўнымі колерамі аб'екта былі аранжавы і жоўты.



Неўзабаве ўнізе, пад слупам, пачалі з'яўляцца серабрыстыя ззяючыя «маланкі». Рознай канфігурацыі і абрысаў. Яны пастаянна пераўтвараліся. Аднак некалькі аб'ектаў былі строга зафіксаваны. Сярод іх асабліва ўразіла фігура жанчыны ў доўгім хітоне. Выразна былі бачны рысы твару, маладога, прыгожага, адухоўленага. Калі б над яе галавой свяціўся німб, можна было б падумаць, што гэта воблік боскай маці з карціны якога-небудзь славутага мастака эпохі Адраджэння. Злева ад жанчыны знаходзілася нешта накшталт шэрага шатра або вігвама...

Разам з сынам Анатолем мы выбеглі на вуліцу. Там ужо сабраўся натоўп.

Сонца, нягледзячы на вячэрні час, асляпляла. Пад ім, як міраж,— тры возеры з яркімі блікамі на вадзе. Лявей вясёлкавага «слупа» я ўбачыла яшчэ адзін — гэткі ж. Паміж імі нечакана з'явіўся вялікі блакітны шар, быццам школьны глобус з размытымі абрысамі мацерыкоў. Неўзабаве з яго ўзнік яшчэ адзін — крыху меншы, жоўтага колеру. З гэтага аб'екта ў сваю чаргу паволі «выплыў» аранжавы ромб з двума «пялёсткамі» ў верхняй частцы, які амаль цалкам яго «закрыў».

Потым усё пачало знікаць, быццам растварацца. Спачатку «малюнкі», потым — шары. Стаў блякнуць, нібы згасаць, правы «слуп». У гэты час каля левага з'явіліся пяць чорных дугападобных палос. Яны нібы працягнуліся да процілеглага аб'екта і зніклі ў ім. Адразу ж каля правага «слупа» заззялі пяць серабрыстых хвалепадобных ліній, што неўзабаве таксама «растварыліся».

«Слупы» ж трымаліся ў небе яшчэ мінут дваццаць. Потым зніклі і яны.

У мяне ліхаманкава білася сэрца, праймалі дрыжыкі. Глянула на гадзіннік. Цуд доўжыўся каля 40 мінут.

Гэты цуд меў працяг. Справа ў тым, што у ноч, якая надышла за «незвычайным» вечарам, у розных раёнах горада мінчане назіралі вогненна-чырвоны шар памерам з поўны месяц, які на працягу 30 мінут трансфарміраваўся ў «васьмёрку», паласу, трохкутнік.

Першае, што я зрабіў, атрымаўшы гэту інфармацыю,—звязаўся са спецыялістамі-метэаролагамі: магчы-

ма, «цуд» звязаны з нейкімі атмасфернымі з'явамі. Тыя без ваганняў адказалі: «Не».

...Летам 1989 года многія газеты краіны перадрукавалі з латвійскай «Советской молодежи» артыкул рыжскага журналіста П. Мухортава «М-скі трохкутнік, або Чужыя тут не ходзяць». У ім аўтар падрабязна расказваў пра адзін з раёнаў Пермскай вобласці, дзе рэгулярна з'яўляюцца НЛА (як правіла, «лятаючыя шары»). Пададзена гэта было як сенсацыя. Адпаведна ўспрыняла яе шматмільённая чытацкая аўдыторыя краіны. Між тым, з пункту гледжання ўфолагаў, ніякай сенсацыі тут няма. Бо «анамальных зон» толькі ў нашай краіне каля 300. У прыватнасці, у Беларусі такое месца знаходзіцца на тэрыторыі Вілейскага раёна. Для соцен мясцовых жыхароў «лятаючыя шары» (менавіта яны часцей за ўсё тут «гасцююць») сталі з'явай даволі прывычнай. Так, летам і восенню 1989 года НЛА неаднаразова з'ўляліся над самім райцэнтрам, вёскай Сасноўка. У кастрычніку — снежні штодзень (!) курсіравалі ў раёне вёсак Дубраўка, Кумельшчына і Сцешыцы. Лятаюць яны і ў ваколіцах... маёй роднай вёскі Нясцёркі і суседняга Латыгаля.

Наслухаўшыся расказаў аб незвычайных аб'ектах, што трывожаць спакой маіх землякоў, я прапанаваў наведаць маю радзіму спецыялістам рэспубліканскага камітэта па энерга-інфармацыйнаму абмену ў прыродзе і мінскай групы па вывучэнню анамальных з'яў. Іх вывад адназначны: так, гэта НЛА. Прычым, як заявілі госці, па іх меркаванню, шароў у ваколіцах Нясцёрак і Латыгаля лятае значна больш, чым сцвярджаюць відавочцы. Справа ў тым, што многія з іх... нябачныя для чалавечага вока. І зафіксаваць іх можна толькі пры спецыяльнай фотаздымцы або радыёлакатарамі.

Далей — болей. Вывучаючы «вілейскі феномен», спецыялісты прыйшлі да заключэння, што на тэрыторыі раёна знаходзіцца нешта накшталт своеасаблівай «пасадачнай пляцоўкі» неапазнаных лятаючых аб'ектаў. Сёння яе месцазнаходжанне вызначана даволі дакладна. Тут пабывала некалькі экспедыцый. Зроблены дзесяткі здымкаў, на якіх выразна бачны скапленні вялікіх і малых цел шарападобнай формы (упершыню такая фатаграфія была апублікавана ў адным з майскіх (1990 г.) нумароў «Звязды»).



Тут нецярплівы чытач, напэўна, спытае: адкуль жа бяруцца гэтыя самыя шары, а таксама іншыя НЛА, якая іх будова, якім чынам ажыццяўляецца іх рух, трансфармацыя?

Ох, ужо гэты цікаўны чытач! Усё яму падай на спадачку з блакітным шлячком. Гэта не так проста...

Сёння спецыялісты ўжо ведаюць, што з'яўленне неапазнаных лятаючых аб'ектаў (у прыватнасці, шароў) на Зямлі звычайна, як правіла, напрамую звязана, па меншай меры, з двума фактарамі. Наяўнасцю паблізу (у межах пяці кіламетраў) тэктанічнага разлому. (Упершыню гэту заканамернасць выявілі французскія вучоныя, у нашай краіне аналагічныя вынікі атрымалі томскія і мінскія спецыялісты.) І — рэзкімі зьмяненнямі ў дадзены час электрамагнітнага поля планеты (адкрыццё, зробленае ў Беларусі). Я невыпадкова падкрэсліў «на Зямлі». Справа ў тым, што яшчэ ў 1969 годзе амерыканскі астранаўт М. Колінз сфатаграфаваў НЛА (у выглядзе двух счэпленых шароў) над паверхняй Месяца. Здымак гэты даў новую глебу для думак вучоных, якія імкнуліся вытлумачыць феномен «лятаючых талерак» выключна з



«зямных» пазіцый. Ну, а вось наконт паходжання, саставу НЛА, механікі іх руху, мудрагелістых пераўтварэнняў, раптоўнага знікнення і да т. п., мусіць, не зможа даць навукова абгрунтаванага тлумачэння ніводны чалавек. Гэтаксама, як і наконт іншапланецян — разумных істот, што, па меркаванню многіх уфолагаў, наведваюць нашу планету.

## Прывітанне, «зялёныя чалавечкі»!

Спецыялісты па НЛА сцвярджаюць, што першая «афіцыяльна зарэгістраваная» «сустрэча» з «зялёнымі чалавечкамі» (так уфолагі жартаўліва называюць іншапланецян) адбылася 2 ліпеня 1947 года каля горада Розуэл, што ў амерыканскім штаце Нью-Мексіка. Тут быццам бы разбіўся лятаючы апарат незямнога паходжання, былі знойдзены яго абломкі, а таксама — чатыры нежывыя істоты, «біялагічна непадобныя на людзей». Усё гэта нібыта захоўваецца ў засакрэчаным, так званым «зялёным пакоі» ваеннага ведамства ЗША.

Журналісты і ўфолагі неаднаразова спрабавалі даведацца пра тайны вакол «трагедыі ля Розуэла». Аднак беспаспяхова. Апошняя такая спроба была зроблена ў 1987 годзе, на міжнародным сімпозіуме па НЛА у Вашынгтоне, удзельнікі якога звярнуліся ў ЦРУ з просьбай рассакрэціць дакументы па гэтай «трагедыі», на што атрымалі лаканічны адказ: «Дакументы знішчаны».

Цікавасць і настойлівасць, з якой прадстаўнікі прэсы і спецыялісты па НЛА дамагаюцца доступу да дакументаў, звязаных з «розуэлаўскай гісторыяй», зразумелая. Апошнім часам паведамленні аб сустрэчах людзей з «зорнымі караблямі» і «прышэльцамі» літаральна запаланілі прэсу. Сустрэчы такія, як сведчыць друк, мелі месца ў Пермскай і Валагодскай абласцях, Фрунзе, Кіеве, Варонежы і іншых месцах. Не абмінулі «іншапланецяне» і Беларусь. Зрэшты, прадставім слова відавочцам.

Жыхар г. п. Багушэўск Сенненскага раёна Дзмітрый Шмуратка:



«Гэта здарылася 3 кастрычніка 1989 года. Я быў у лесе. З горачкі ўбачыў: пад елкамі — вялікі зялёна-жоўты, быццам разлінаваны на маленькія квадрацікі, прамавугольнік. Ён наскрозь прасвечваўся. Калі я пайшоў да яго, то ўбачыў яшчэ адзін такога ж колеру, толькі без лінеек.

Мне стала ніякавата, і я вырашыў пакінуць гэта месца. Але не мог зрабіць і кроку: быццам нейкая сіла прыціскала да зямлі. Глянуў уверх і ўбачыў аблачынку. Яна апускалася на зямлю. Каля вяршалін дрэў спынілася. У цэнтры я разгледзеў... чалавека. Ён аддзяліўся ад аблачынкі, паплыў да мяне і стаў у метрах 10—15. Каля двух метраў ростам. Твар ружовы, нос прадаўгаваты, з гарбінкай, вочы чорныя. Лоб і шчокі былі абцягнуты невядомым мне матэрыялам. Апрануты ў нешта накшталт плашча з капюшонам. Адзенне моцна вібрыравала, і ад яго зыходзілі як бы промні, што хутка мянялі колер.

Некалькі хвілін мы знаходзіліся адзін насупраць аднаго. Я на імгненне павярнуў галаву, а калі зноў глянуў на тое месца, дзе стаяў «чалавек», яго ўжо не было...»

Трактарыст саўгаса «Далгінава» Вілейскага раёна Мікалай Паслед:



«Неяк (восень 1989 года) а чацвёртай гадзіне ночы я выйшаў з хаты і пачуў крокі на вуліцы. Адначасова бліснула чырвонае святло. Я падышоў да плота і аслупянеў. Па вуліцы рухалася «нешта» накшталт двухметровай размытай фігуры. «Яно» свяцілася: ярка-чырвонае святло ўсярэдзіне паступова пераходзіла ў аранжавае па контуры «істоты». Гэта «нешта» нетаропка «прайшло» міма вясковых хат і схавалася ў лесе».

Мінчанін Уладзімір Давыдаў:

«Была ноч (з 2 на 3 красавіка 1990 года). У пакоі гарэла святло. Я не спаў. Раптам заўважыў, што ў фортку ўлазіць чалавекападобная «істота» з гібкім целам. За ёй яшчэ некалькі. З лысымі бугрыстымі галовамі, цёмнымі вачыма. Рост каля 180 сантыметраў, целы ружовыя, бы ў немаўлят. Ад страху заплюшчыў вочы. Калі разамкнуў павекі, убачыў двух «істот», але ўжо ў чорным адзенні накшталт накідак або балахонаў. Адна з іх працягнула руку ў мой бок, з яе зляцела полымя. Адчуў удар у сэрца, мяне паралізавала, і я пачаў траціць прытомнасць. Калі прыйшоў у сябе, у пакоі нікога не было. Але адчуванне страху заставалася. Некаторы час з цяжкасцю мог вымаўляць словы. Пасля ўсё прайшло».

Паралічаныя выпадкі не адзінкавыя. Так, маці і дачка Бокшы, пра якіх я расказваў у пачатку нарыса, сцвярджаюць, што бачылі не толькі НЛА, але і яго «пасажыраў» — «трохметровых істот у чорных скафандрах з вузкімі блакітнымі палоскамі на галовах, якія перамяшчаліся з вялікай хуткасцю».

У маі 1989 года віцябчанка В. Лебедзева ў ваколіцах абласнога цэнтра сутыкнулася з пяціметровай цёмна-зялёнай чалавечай фігурай з матавым «каўпаком» замест галавы. 6 ліпеня непадалёк ад піянерскага лагера «Фестывальны» ў Валожынскім раёне чацвёртакласнік Раман Луцкін сустрэў «гуманоіда», які нагадваў «снежнага чалавека». Неўзабаве пасля гэтага над лесам узляцеў «прадмет», падобны на талерку.

25 ліпеня ў Магілёўскім раёне трактарыст В. Зайцаў з адлегласці 200 метраў назіраў аб'ект бронзавага колеру, які нагадваў дзіцячую юлу, згладжаную зверху і знізу. Аб'ект вісеў у чатырох метрах над зямлёй. Побач з ім



знаходзіліся дзве амаль трохметровыя істоты ў ззяючым адзенні.

У жніўні над вёскай Вялікая Гаць Івацэвіцкага раёна ўзнік «слуп» вышынёй 1,5 метра і дыяметрам 40 сантыметраў, які свяціўся. На яго фоне з'явіліся спачатку фігура мужчыны, а потым — прыгожая жанчына, што здаваліся мармуровымі скульптурамі.

24 верасня над вёскай Катка Глускага раёна падлеткі Міша Рэзнік і Саша Якавенка бачылі яркі шар і чалавекападобную істоту.

У ноч з 21 на 22 сакавіка 1990 года над адным з раёнаў Бабруйска завісала «талерка» з ружовай паласой пасярэдзіне. Тады ж на адной з вуліц бачылі чатыры шэрыя чалавечыя фігуры каля 2,5 метраў вышынёй.

27 і 28 красавіка ў ваколіцах вёсак Брольнікі, Суляцічы і Мольнічы Навагрудскага раёна ўзнікалі чырвоныя і аранжавыя шары. 27 красавіка ў 23 гадзіны на вуліцы вёскі людзі бачылі трох «гуманоідаў» 2,5-метровага росту ў «шубах» з капюшонамі, якія свяціліся.

Згодна са сцвярджэннямі сведак, «іншапланецяне» іншы раз уступаюць у самыя цесныя кантакты з людзьмі. Так, у жніўні 1990 года па рэспубліканскім тэлебачанні



было паказана інтэрв'ю, якое беларускі тэлежурналіст Іван Беладубенка ўзяў у мужчыны, што пажадаў застацца невядомым. Мужчына расказаў ні многа, ні мала аб… сваім палёце на іншапланетным караблі. У асяроддзі людзей, якія займаюцца вывучэннем НЛА, добра вядома імя мінчаніна Уладзіміра Трусава. На працягу 1989—1990 гадоў ён даў журналістам некалькі інтэрв'ю, у якіх заявіў, што нібыта рэгулярна ўступае ў кантакт з прадстаўнікамі незямных цывілізацый.

Да такіх выказванняў можна ставіцца па-рознаму. Аднак нельга не заўважыць, што сур'ёзных доказаў «кантактаў» з іншапланецянамі пакуль што нягуста, а тыя сведчанні, што ёсць, нярэдка даволі спрэчныя.

Многія з тых, хто вывучае праблему НЛА і іншапланецян, магчыма, запярэчаць. Па-першае, сцвярджаюць яны, доказы ёсць, прытым, як кажуць, выключна матэрыяльныя. Па-другое, з'явы, пра якія ідзе размова, незвычайныя, а таму іх, напэўна, немагчыма вывучыць «звычайнымі» метадамі, пацвердзіць «традыцыйна» навукова. Пярэчанні прымаю. Аднак наконт першага, тым не менш, скажу: так, доказы быццам бы ёсць (напрыклад, жалезныя «шарыкі» і свінцовыя «сетачкі» з «месца катастрофы» НЛА у Дальнагорску 29 студзеня 1986 года). Але, і гэта не сакрэт, ужо не раз пры сур'ёзным даследаванні «дэталей НЛА» аказвалася, што яны зямнога паходжання.

Так, па руках мінскіх энтузіястаў вывучэння анамальных з'яў у свой час хадзіў дзіўны прадмет, пра які гаварылася, што гэта ці то асколак «зорнага карабля», ці то кавалачак ад рэшткаў збудавання, якое некалі ўзвялі прышэльцы ў «М-скім трохкутніку». Мне ўдалося адшукаць чалавека, які яго адтуль прывёз. Ён доўга смяяўся, а потым сказаў, што «незямная рэліквія» — асколак зямнога керамічнага вырабу. Пасля таго як гэта было выяўлена шляхам даволі простых даследаванняў, ён падарыў асколак свайму знаёмаму…

І ўсё ж да загадкі НЛА і іншапланецян, напэўна, нельга падыходзіць са звычайнымі меркамі, спрабаваць знайсці ім адпаведнае месца ў класічных навуковых будовах і схемах. І тут, на мой погляд, несумненна цікавыя



гіпотэзы, з дапамогай якіх можна растлумачыць сутнасць гэтага феномена. З некаторымі я і хачу пазнаёміць чытача.

## Гронка гіпотэз

Гіпотэзы, якія тлумачаць прыроду НЛА і іншапланецян, можна падзяліць на дзве групы. Першая ўключае ў сябе здагадкі аб выключна зямным паходжанні такіх з'яў. У прыватнасці, шырока вядомая версія аб існаванні на нашай планеце так званага паралельнага свету або нават светаў, якія зроблены зусім з іншага «матэрыялу» і функцыяніруюць у вымярэннях (іх, на думку прыхільнікаў гэтай гіпотэзы, не менш як сем), што недаступныя чалавечаму ўспрыняццю. Іншы раз элементы гэтых светаў «прарываюцца» ў наша быццё, і тады людзі, прыборы фіксуюць іх.

Карані арыгінальнага меркавання цягнуцца ў далёкія тысячагоддзі. Ужо старажытныя грэкі гаварылі аб мностве зямных светаў. Напрыклад, у V стагоддзі да нашай эры філосаф Анаксагор быў упэўнены, што ў кожнай часцінцы, якой бы малой яна ні была, «ёсць гарады, населеныя людзьмі, апрацаваныя палеткі, і свеціць сонца, месяц і іншыя зоркі, як у нас». Наш вялікі суайчыннік К. Э. Цыялкоўскі лічыў, што «матэрыя не адразу была такой шчыльнасці, як цяпер. Існавалі стадыі непараўнальна больш разрэжанай матэрыі. Яна магла стварыць істот нам недаступных, нябачных…»

Прыхільнікі гэтай гіпотэзы сцвярджаюць, што анамальныя зоны тыпу пермскай ці вілейскай ёсць не што іншае, як месцы найбольш інтэнсіўных «прарываў» элементаў паралельных светаў у наш. Масавыя з'яўленні НЛА у апошні час тлумачаць пагаршэннем экалагічнай абстаноўкі (у Беларусі звязваюць з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС), у выніку чаго парушыліся нейкія важныя звёны ў натуральнай «перагародцы», што аддзяляе «іх» ад нас.

З гіпотэз, што трактуюць феномен НЛА і іншапланецян, як іншапланетныя, асабіста мне імпануюць дзве,

звязаныя ў сваю чаргу з гіпотэзай аб так званай пансперміі, згодна з якой жыццё на Зямлі не самазарадзілася, а было занесена звонку або створана штучна. Дарэчы, на яе карысць сведчаць і даследаванні некаторых вучоных-генетыкаў, якія выказваюць думку, што для жыцця неабходна малекула ДНК адразу ў гатовым выглядзе, што яна не можа з'явіцца ў працэсе эвалюцыі. А калі жыццё было занесена на Зямлю, то, магчыма, і чалавек быў створаны штучна або перасяленны з якой-небудзь зорнай сістэмы.

Дык вось, некаторыя спецыялісты сцвярджаюць, што першых людзей на нашу планету даставілі іншапланецяне. Па адной версіі,гэта былі іх супляменнікі, якія здзейснілі цяжкія злачынствы і, пазбаўленыя памяці, накіраваныя ў касмічную высылку. Па другой — зямляне — вынік біялагічнага эксперыменту. Як бы там ні было, з таго часу ажыццяўляецца так званы «глабальны кантроль» за нашым развіццём — бесперапыннае назіранне з сур'ёзнымі «папярэджаннямі», у выпадках, калі недзе на планецe ўспыхваюць буйныя канфлікты, падае маральнасць або адбываецца нешта, калі так можна сказаць, не вельмі прыстойнае. «Папярэджанні» — рознага роду катаклізмы (паводкі, землятрусы, ураганы), эпідэміі або катастрофы, пасля якіх людзі павінны задумацца і не рабіць глупства.

Некаторыя ўфолагі (у прыватнасці, масквіч, кандыдат гістарычных навук А. Новікаў) лічаць, што для прышэльцаў Зямля з'яўляецца таксама нечым накшталт касмічнага «чысцілішча». Яны пасылаюць сюды сваіх прадстаўнікоў для таго, каб тыя ўбачылі, што адбываецца ў асяроддзі людзей, жахнуліся і, мусіць, зрабілі нейкія важныя для сябе вывады.

Але гэта яшчэ не ўсё. Час ад часу іншапланецяне забіраюць з сабой зямлян, так сказаць, для «падтрымання свайго генафону». У гэтай сувязі, напрыклад, У. Ажажа мяркуе, што сярод соцень тысяч людзей, якія прапалі без весткі, пяць з паловай тысяч, магчыма, былі выкрадзены НЛА. Прычым, забіраюць неабавязкова «жыўцом». Іншы раз — толькі «душы». Як правіла, найбольш каштоўныя. Звычайна ў сувязі з гэтым ідуць спасылкі на



заўчасныя смерці Пушкіна і Лермантава, Байрана і Шуберта, Ясеніна і Высоцкага, многіх іншых выдатных дзеячаў літаратуры, мастацтва, буйных вучоных накшталт Каралёва. Часта ўпамінаецца таксама Гагарын.

Другая гіпотэза — аб «цёмных» і «светлых» прышэльцах. На ёй я спынюся больш падрабязна, бо ў адрозненні ад меркавання-здагадкі аб «глабальным кантролі» яна даволі сур'ёзна аргументавана і ў ёй не так ужо шмат фантастычнага.

Яна таксама сцвярджае, што зямлян перасялілі на нашу планету або проста «стварылі» «светлыя». Пасля чаго ўзялі іх пад сваю «апеку». У «светлых» высакародная мэта: спрыяць людзям у дасягненні найвышэйшага ўзроўню развіцця, які прадугледжвае поўнае спасціжэнне «касмічных» законаў, што дапаможа разарваць путы прасторы і часу, свабодна існаваць ва ўсіх вымярэннях Сусвету.

У старажытнасці «светлыя» неаднаразова з'яўляліся на Зямлю ў выглядзе багоў і прарокаў, якія пакідалі пасля сябе своеасаблівыя «маральныя кодэксы» ўдасканаленне людзей, а таксама — першапачатковыя веды аб нашай планеце і Сусвеце. Звесткі аб падобных з'явах



можна знайсці ў многіх старажытных крыніцах. А ў індыйскім эпасе «Махабхарата» ўтрымліваецца нават расказ аб канструкцыі «звездалётаў» прышэльцаў: «Лятаючыя машыны мелі форму сферы і рухаліся па паветры з дапамогай ртуці, якая стварала моцны вецер і штурхала машыну. Людзі, якія сядзелі ў машыне, маглі пераадольваць велізарныя адлегласці за вельмі кароткі час...»

Акрамя «прамога кантакту» прадстаўнікі незямных цывілізацый дзейнічалі і па метаду, які сёння назвалі б «тэлепатычным»,— укладвалі ў мозг чалавека адпаведную інфармацыю, выклікаючы так званае «азарэнне», а пасля кіравалі працэсам яе рэалізацыі. У тым жа напрамку яны «вядуць работу» і цяпер.

Трэба сказаць, што фактаў, на якіх грунтуецца гіпотэза, нямала.

Напрыклад, з гісторыі шырока вядома «азарэнне» прарока Мухамеда, калі неадукаваны пастух, пасля таго як у сне яму з'явілася «бажаство», стварыў вучэнне і завалодаў розумамі тысяч людзей. Тое ж самае адбылося з Жаннай д'Арк, якая пасля «азарэння» заявіла, што «выратуе Францыю». Даволі спрэчнай, але вельмі «інтрыгуючай» з'яўляецца таксама версія, што Мендзялееў табліцу сваёй сусветна вядомай перыядычнай сістэмы элементаў «убачыў» у сне.

Менш грандыёзныя, але не менш цікавыя выпадкі мы сустракаем і ў сучаснасці. Так Алан Чумак у інтэрв'ю, якое было надрукавана ў газеце «Московские новости», на пытанне карэспандэнта: «Ці быў у вас канкрэтны настаўнік, які вас гэтаму вучыў?» адказаў: «Не, я чую голас. Як хочаце, так і разумейце. Звычайна «сеансы сувязі», так я іх называю, ідуць ноччу з адзінаццаці вечара да чатырох раніцы. Я сяджу, а голас мне расказвае аб методыцы лячэння, аб энергіі, аб многім іншым. Голас унутры мяне. Я бачу малюнкі...»

Можна верыць і не верыць... Але як быць, напрыклад, з выпадкам, што адбыўся ў Мінску ў верасні 1984 года? А ці не доказ гэта таго, што кантакты (яўныя або тэлепатычныя) са «светлымі» ўдасканальваюць чалавека фізічна, разумова, духоўна?

...У адну з начэй трынаццацігадовая Святлана (прозвішча па просьбе бацькоў і яе самой не называю) раптам прачнулася. Прычым адчуванне было такое, што «як быццам і не спала». Зірнула на гадзіннік. 3.00. Паднялася, каб выйсці з пакоя. Нечакана ў акне ўспыхнула святло. Святлана ўбачыла: далёка над лесам «вісяць» тры авальныя прадметы салатавага колеру. Неўзабаве яны пачалі дрыжаць, потым ад іх як бы нешта аддзялілася. І тут... У пакоі з'явіліся тры істоты ў чалавечым абліччы, якія свяціліся салатавым колерам. Твар адной з іх Святлана запомніла вельмі добра. Ён быў круглы, шырокі ў скулах. Вялікія прадаўгаватыя вочы, якія міргалі, маленькія рот, нос, востры падбародак, гладка зачэсаныя назад валасы (як потым высветлілася, у многім гэта быў «партрэт» яе самой). «Госці» нічога не гаварылі, але Святлана зразумела, што яны пытаюцца, ці верыць яна ў прышэльцаў з іншага свету. Святлана нейкім чынам, хутчэй за ўсё ў думках, адказала: веру. Пасля гэтага незразумелая сіла «перасунула» дзяўчынку амаль ушчыльную да «іншапланецян». Рука яе міжволі паднялася і апусцілася на плячо аднаго з іх.

Потым наступіў правал у памяці. Апрытомнела Святлана ў другім канцы пакоя, у паўляжачым стане. Адчула моцны тупы боль у двух кропках ілба. Раніцай у яе моцна кружылася галава, трэсліся рукі.

На наступную ноч дзяўчынка прачнулася ў такі ж час — 3.00. Адчула страх. У гэты момант з вуліцы данёсся непрыемны гук, які як бы «рэзаў» паветра. Усё цела працяў рэзкі боль. Потым цела торгнулася, боль знік, аднак з'явіліся тыя ж, што і напярэдадні, тупыя болі лба. Раніцай зноў кружылася галава.

І на трэцюю ноч было тое ж «пунктуальнае» абуджэнне. Аднак без якіх-небудзь праяў. Ранішнія адчуванні паўтарыліся. Галаўны боль не адпускаў каля тыдня. Потым ужо галава ў Святланы не балела...

Гэты выпадак у свой час даследавала і апісала вучоны сакратар рэспубліканскага камітэта па энерга-інфармацыйнаму абмену ў прыродзе Кацярына Агеенкава.

Дык вось, спецыяльнае абследаванне паказала, што ў Святланы няма нават самых малых адхіленняў у псіхіцы. Затое пасля «кантакту» з'явілася іншае. У дзяўчынкі

рэзка палепшылася памяць (нават вялікі верш яна завучвала пасля 2—3 прачытванняў). Стала спаць на цвёрдай пасцелі, без падушкі і коўдры. Прычым у любое надвор'е — з адкрытай форткай. Адчуваючы, што не спіць, магла бачыць сны. І што адметна, «сюжэты» іх цалкам падпарадкоўваліся яе жаданню. 2—3 сутак магла наогул не спаць, захоўваючы пры гэтым бадзёрасць, яснасць думкі. Пачала прачынацца без будзільніка ў любы патрэбны час. Прыкладна праз год стала пісаць вершы, выявіла ў сябе здольнасць «усыпляць» людзей, што нават дэманстравала сваім сябрам. У раннім дзяцінстве Святлана перанесла хваробу сэрца і была вызвалена ад заняткаў фізкультурай. Пасля «кантакту» магла пераносіць нават высокія фізічныя нагрузкі. І нарэшце, паводле слоў дзяўчынкі, стала прадчуваць некаторыя падзеі, удзельніцай якіх яна бывае і будзе ў будучым.

Ну, а што «цёмныя»? Якая іх роля на нашай планеце? Прама процілеглая «функцыі» «светлых». Іх канчатковая мэта, ні многа ні мала — знішчыць чалавецтва. Прычына? Па адной версіі, мы вылучаем у космас псіхічную энергію, якая ўтварае псіхаполе, што працягвае самастойнае існаванне, пагражаючы іх генезісу. Па другой — заражаныя «бактэрыямі» думак і «некіруемых пачуццяў», а таму з выхадам у Сусвет можам загубіць іх цывілізацыю.



Калі б не «заступніцтва» «светлых», якія нейтралізуюць або «змякчаюць» негатыўнае ўздзеянне «цёмных», чалавецтва, магчыма, ужо б не існавала. Аднак любая сустрэча з гэтымі «касмічнымі вандаламі» нясе не толькі непрыемнасць, але і сур'ёзную небяспеку.

У падтрымку такога меркавання прыводзіцца нямала прыкладаў. Так, 2 ліпеня 1956 года ў ЗША лятаючая талерка падпаліла «Старфаер» — самалёт-перахопнік 27-й эскадрыллі ВПС ЗША. Пілот і аператар цудам засталіся жывыя, выкінуўшыся з парашутамі.

Сярод уфолагаў добра вядома таксама гісторыя загадкавай катастрофы пасажырскага самалёта з 80 чалавекамі на борце над Цірэнскім морам, калі запісы паказанняў радараў італьянскай службы сачэння за палётамі засведчылі, што ў раёне гібелі прысутнічаў «неапазнаны лятаючы аб'ект, які зрабіў атакуючы манеўр».

А вось сведчанне, якое, на маю думку, не падлягае сумненню, бо зыходзіць ад такога аўтарытэтнага даследчыка, як старшыня секцыі вывучэння анамальных з'яў Усесаюзнага астраномa-геадэзічнага таварыства А. Лістратава.

Восенню 1989 года ў інтэрв'ю газеце «Социалистическая индустрия» ён расказаў аб працягу гісторыі, пра якую ў свой час пісала газета «Труд» у артыкуле «Роўна ў 4.10...». Нагадаю, у ім ішла гаворка аб сустрэчы самалётаў ТУ-134А, які выконваў рэйс па маршруце Тбілісі, зблізіўся з аб'ектам. Тады НЛА направіў яркі маршруце «Ленінград — Барыспаль — Батумі — Тбілісі», з велізарным НЛА. Самалёт, што трымаў курс на Тбілісі, зблізіўся з аб'ектам. Тады НЛА направіў яркі прамень на кабіну лайнера. Прамень прайшоў па целе камандзіра. Другі пілот закрыўся рукой ад асвятляльнага святла. Абодвум лётчыкам стала горача.

Далей, як сведчыць А. Лістратаў, падзеі разгортваліся наступным чынам. Цытую: «Праз некалькі месяцаў камандзір карабля памёр у Боткінскай бальніцы ад рака. У гісторыі яго хваробы зроблены вельмі дзіўны запіс: «Паражэнне арганізма ў выніку ўздзеяння выпрамень-

вання ад неапазнанага лятаючага аб'екта...». Мне даводзілася сустракацца з другім пілотам. Лёс яго пакуль што менш трагічны. Але і гэты раней здаровы чалавек неўзабаве пасля сустрэчы з дыскам быў спісаны з авіяцыі па інваліднасці... А абследаванне паказала, што ў яго зменены «ізатопны састаў цела...».

...Зрэшты, гіпотэзы ёсць гіпотэзы. А аб'ектыўная рэальнасць ёсць аб'ектыўная рэальнасць. У адносінах да НЛА у нашай краіне яна такая, што «лятаючымі талеркамі» і «гуманоідамі» да нядаўняга часу займаліся пераважна энтузіясты-адзіночкі або ў лепшым выпадку таварыствы, створаныя на грамадскіх пачатках. «Афіцыйная» навука чамусьці ўпарта не жадала ні прызнаваць «феномен НЛА», ні тым больш, яго даследаваць. І толькі вясной 1990 года пры Акадэміі навук быў створаны Усесаюзны міжгаліновы ўфалагічны навукова-каардынацыйны цэнтр, які ўзначаліў Уладзімір Ажажа.

У Вялікабрытаніі яшчэ з 1952 года пры міністэрстве абароны існуе спецыяльны аддзел «Паветраны штаб 2», у архівах якога захоўваецца каля трох тысяч апісанняў выпадкаў з'яўлення НЛА. У ЗША дзейнічае спецыяльная служба, якая сочыць за неапазнанымі лятаючымі аб'ектамі і нават распрацоўвае сакрэтныя праграмы, звязаныя з імі. У прыватнасці, ёсць звесткі, што пры стварэнні «нябачнага» бамбардзіроўшчыка «В-2», гэтак жа, як і абароннай сістэмы ЗША, выкарыстаны элементы «незямной» тэхналогіі. Адпаведныя арганізацыі даўно працуюць у Францыі, Італіі, Бельгіі...

## Замест эпілога

...У людзей, якія сустракаліся з НЛА або нават «уступалі ў «кантакт» з «прышэльцамі», я заўсёды пытаю, што яны адчувалі ў гэты час. Пераважная большасць адказвае: страх. Прытым іншы раз не зусім звычайны, які мы зведваем, калі пагражае якая-небудзь небяспека, а страх, што на нейкія імгненні паралізуе волю і розум. А вось адна жанчына на Вілейшчыне нават хацела «памацаць» НЛА і не зрабіла гэтага толькі таму, што



трэба было сачыць за печкай, якая тапілася... На жаль, бывае зусім інакш. Так, у друку паведамлялася аб выпадках, калі па НЛА... стралялі. Напрыклад, у 1956 годзе пілот рэактыўнага знішчальніка адной з баз ВПС на Акінаве адкрыў па НЛА агонь — і загінуў. У 70-х гадах спробу збіць «лятаючую талерку» зрабілі ў раёне Тэгерана лётчыкі двух «Фантомаў», але ў іх нечакана выйшла са строю сістэма кіравання пускам ракет. Замежная прэса, а потым «Комсомольская правда» апублікавалі інфармацыю аб абстрэле НЛА ракетамі ў 50-х гадах на нашым Далёкім Усходзе.

Нататкі гэтыя я напісаў не толькі для таго, каб яшчэ раз засярodзіць увагу на праблеме НЛА, пазнаёміць з гіпотэзамі, што звязаны з іншапланецянамі. Магчыма, мае нататкі прымусяць чытачоў задумацца над тым, як яшчэ многа ў прыродзе дзіўнага, неразгаданага, таямнічага. Як непарыўна злучаны мы з Сусветам, з працэсамі, якія ў ім адбываюцца. А яшчэ — над тым, што прыйдзе дзень, калі нарэшце чалавек зробіць крок за межы Сонечнай сістэмы. Я ўпэўнены, што такі дзень настане... Як упэўнены і ў тым, што вельмі важна, з якімі думкамі, памкненнямі і мэтамі будзе зроблены гэты крок.





## ПОШУКІ. АДКРЫЦЦІ. ЗНАХОДКІ

*Міхась Лібінтаў, журналіст*

### Назвалі прыбор... тэрмометрам

Гляджу на тэрмометр, выраблены ў 1941 годзе. Ён нагадвае сучасны, вось толькі шкляная колба яго крыху меншая, а металічная шкала — шырэйшая. У фондах Беларускага Дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны гэты адзіны экземпляр лічыцца як экспанат № 39497. Належаў тэрмометр К. П. Чэпіку, урачу партызанскай брыгады ў Чашніках... А ёсць жа ў музеях краіны тэрмометры і больш старадаўнія!

Давайце ўявім сабе самы першы... Дарэчы, адзначым спачатку, што тэрмометр па-грэчаску: «цяпло» і «вымяраю».

Як жа ён выглядаў?

Да шклянога шара, які быў велічынёй з курынае



яйка, прыпайвалася тонкая шкляная трубачка. Саграваючы рукамі шар (а значыць, і паветра ў ім), вучоны пагружаў свабодны канец трубачкі ў сасуд з падфарбаванай вадой. Як толькі шар астываў, аб'ём паветра ў ім змяншаўся, а вада, займаючы яго месца, паднімалася па трубачцы...

Называўся самы першы тэрмометр паветраным тэрмаскопам (па-грэчаску: «цяпло» і «гляджу») і быў вынайдзены ў канцы XVI стагоддзя вялікім італьянцам Галілеа Галілеем.

Наступны прыбор быў вельмі вялікі і таксама складаўся з шара, але ўжо запоўненага вадкасцю, і з зігзагападобнай трубачкі, на якую былі наненесены дзяленні. На працягу дзесяці ўдараў пульса вызначалася тэмпература розных частак цела: вадкасць у трубачцы змяняла вышыню... Стваральнікам гэтага прыбора быў італьянскі ўрач, прафесар Падуанскага універсітэта Санторыа.

У тыя далёкія часы вучоныя наіўна меркавалі, што паветра, якім дыхае чалавек, ідзе непасрэдна з сэрца і нясе «жыццёвую цеплыню». Таму, вымяраючы гэтую «жыццёвую цеплыню», Санторыа лічыў, што спасцігае галоўную тайну чалавечага арганізма...

У XVII стагоддзі з'явілася мноства разнастайных па форме тэрмометраў. Вось, напрыклад, галандскі варыянт — з трубкай і двума маленькімі «шарамі»-жабянятамі, якія прымацоўваліся да скуры пластырам. Полацць жабянят запаўнялася вадкасцю, на паверхні якой плавалі каляровыя шарыкі з рэчываў рознай шчыльнасці.

Як вымяралася тэмпература цела?

Вадкасць, саграваючыся, павялічвала свой аб'ём, а шчыльнасць змяншалася. І тады некаторыя шарыкі апускаліся на дно прыбора. Колькі шарыкаў заставалася на паверхні — такой і лічылі тэмпературу!

Першым жа тэрмометрам, паказанні якога не залежалі ад перападаў атмасфернага ціску, быў тэрмометр, створаны пры двары імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі Фрыдрыха II у 1641 годзе.

Добра знаёмай усім нам шкалы градусаў тады яшчэ не існавала. Вучоныя доўга не маглі знайсці тыя два зы-

ходныя пункты, адлегласць паміж якімі трэба было падзяліць на роўныя часткі. Ньютан, геніяльны англійскі вучоны, выбіраў, напрыклад, пункты таяння лёду і нармальнай тэмпературы чалавечага цела.

Пазней галандскі фізік Фарэнгейт стварыў першы надзейны ртутны тэрмометр са шкалой ад 0 да 600 градусаў — г. зн. да тэмпературы, пры якой закіпала ртуць. У якасці зыходных Фарэнгейт выкарыстоўваў ужо не два, а тры пункты. Трэцім пунктам была нармальная тэмпература поласці рота. Інтэрвал паміж зыходнымі пунктамі шкалы дзяліўся на роўныя часткі, кожная з якіх адпавядала аднаму градусу.

Вось гэты самы тэрмометр Фарэнгейта і дайшоў да нашых дзён амаль без змяненняў!

Апошняе ж слова ў градуіраванні шкалы таго тэрмометра, якім мы карыстаемся сёння, належыць шведскаму астраному і фізіку Андэрсану Цэльсію.

## Сакрэт чароўных шкельцаў

Гэтую цікавую з'яву заўважылі яшчэ старажытныя грэкі і рымляне: шкляны шар, напоўнены вадой, валодае здольнасцю павялічваць прадметы. Але тады гэтае павелічэнне тлумачылі не выпуклай формай паверхні, а дзеяннем вады. Прадпрымальныя ўладальнікі харчэўняў упрыгожвалі такімі шарамі свае вітрыны. Садавіна, пагружаная ў ваду, павялічвалася ў памерах, а стравы скрозь шары здаваліся больш прывабнымі.

Гісторыя данесла да нас паданне з I стагоддзя нашай эры пра славуты смарагд (ізумруд) імператара Нерона: Нерон глядзеў баі гладыятараў скрозь адшліфаваны смарагд. Вось той смарагд і быў, напэўна, правобразам сённяшніх акуляраў. Зялёным смарагдам Нерон карыстаўся «для ўмацавання вачэй». Тагачасныя ювеліры, працуючы, клалі каля сябе зялёнага свяшчэннага жукаскарабея. Ужо тады, у такія даўнія часы, людзі ведалі, што стомленыя вочы пры позірку на зялёнае лепш адпачываюць. Па загаду Нерона нават арэну цырка пасыпалі зялёным пяском са здробленага малахіту, а з



плячэй імператара заўсёды звісала зялёная мантыя.

Але толькі ў X стагоддзі арабскі вучоны Ібн аль-Хайсам (Альгазен) выказаў важнае назіранне: «Калі глядзець праз сегмент шклянога шара, то ён павялічвае прадметы».

Выраблюць шкляныя лінзы, а лінза — аптычнае шкло са сферычнымі паверхнямі, людзі навучыліся вельмі даўно. Але для акуляраў яны шукалі тонкае, бясколернае і празрыстае шкло. У XIII стагоддзі ў Венецыі сакрэт вырабу такога шкла быў знойдзены. Да XVI стагоддзя гэтая тайна строга захоўвалася. І акуляры, як лічаць многія вучоныя, былі вынайдзены хутчэй за ўсё ў Венецыі або ў Паўночнай Італіі ў канцы XIII стагоддзя...

Доўгі час акуляры каштавалі вельмі дорага, што тлумачылася складанасцю вырабу чыстага і празрыстага шкла. Іх, разам з каштоўнасцямі, уключалі ў свае завяшчанні каралі, князі, іншыя багацеі. У народзе ж попыт на акуляры быў не вельмі вялікі: мала хто тады ўмеў чытаць і пісаць. Акулярамі карысталіся толькі адукаваныя і заможныя людзі. І насілі акуляры іншы раз з-за фанабэрыі, з-за жадання паказаць сваё багацце...

Калі ж усярэдзіне XV стагоддзя пачалося кнігадру-



каванне, узрасла і патрэба ў акулярах: іх карысць станавілася відавочнай. Праўда, пакуль толькі для дальназоркіх, бо ўвагнутае шкло для блізарукіх было вынайдзена значна пазней, у XVI стагоддзі.

Канструктары шукалі спосаб «прыладзіць» акуляры да вачэй. Спачатку з'явіўся манокль — адно шкло на доўгай ручцы. Потым пачалі шліфаваць двайное шкло з дзвюма ручкамі — бінокль, які можна было надзець на нос. Пазней паспрабавалі прымацаваць акуляры да капелюша. Далей ушывалі акулярнае шкло ў раменьчык, які завязвалі на патыліцы, быццам карнавальную маску. Прыстасоўвалі спружыны, якія прыціскаліся да скроняў. Апраўлялі шкло ў жалезныя кольцы і злучалі перамычкай — атрымлівалася пенснэ, але без заціску на носе. І, нарэшце, прыстасавалі да акуляраў завушыны — амаль гэтак, як робяць сёння.

...З далёкай старажытнасці прыйшлі да нас сучасныя віды акуляраў з рознымі лінзамі. Бясконца ўдасканальвалася вучонымі і канструктарамі сфера шклянога шара...

## Гаручае — вада?

На адной сустрэчы з вучонымі Акадэміі навук, якія працуюць у галіне аховы навакольнага асяроддзя, быў прадэманстраваны такі эксперымент. У бак легкавога аўтамабіля залілі звычайную ваду, і машына кранулася з месца. Ніякага дыму, ніякіх выхлапных газаў!

Праблема ачышчэння паветра ад забруджвання хвалюе сёння вучоных і спецыялістаў многіх прафесій. Калі ўлічыць, што да 2000 года, паводле прагнозаў спецыялістаў, колькасць аўтамашын у свеце павялічваецца да 600 мільёнаў, актуальнасць аховы навакольнага асяроддзя ад шкодных выкідаў стане яшчэ больш значнай.

Рашэнне праблемы вучоныя бачаць у стварэнні аўтамабільных рухавікоў, якія ўвогуле выключаюць з'яўленне шкодных выкідаў. Работы вядуцца па трох напрамках. Адзін з іх — гэта стварэнне электрамабіляў. Але дыстанцыя прабегу без падзарадкі нават у лепшых з



гэтых машын пакуль не перавышае 80—100 кіламетраў. Другі шлях — выкарыстоўваць у якасці акумулятараў энергіі махававікі, якія круцяцца. Аднак у створаных да гэтага часу такіх гірамабілях шмат тэхнічных недахопаў. Трэці і, на наш пагляд, найбольш цікавы і рэальны напрамак творчага навуковага пошуку звязаны з прымяненнем бясшкоднага паліва, у прыватнасці, вадароду.

Сярод усіх малатаксічных відаў паліва вадарод сёння значыцца як гаручае № 1. Пры згаранні ў паветраным асяроддзі ён утварае ваду. Да таго ж вадарод лёгкацякучы, у працэсе гарэння дае вялікую колькасць цеплавой энергіі. Але ёсць у яго ўласцівасць, якая ператварае прымяненне вадароду ў складанейшую праблему: гэта малая ўдзельная вага. Адзін кубічны метр газападобнага вадароду важыць усяго 90 грамаў. У стандартны прамысловы балон пад ціскам удаецца заправіць прыкладна 0,5 кілаграма вадароду, але сам такі балон важыць... больш як 80 кілаграмаў. Калі прыняць, што для прабегу ў 100 кіламетраў аўтамабілю спатрэбіцца 4—5 кілаграмаў вадароду, то пры такім спосабе захоўвання «бак» для гаручага будзе цяжэйшым за машыну, не гаворачы ўжо аб яго памерах. Вядома, можна было б запасіць вадарод у вадкім стане. Але тады аўтамабіль давя-



лося б аснасціць цяжкімі і складанымі ахаладжальнымі прыстасаваннямі. А галоўнае, машыну не выпусціў бы на вуліцу нават самы спагадлівы аўтаінспектар. Пры сутыкненнях, якіх, на жаль, пазбегнуць пакуль не ўдаецца, такі «бак» з вадародам нёс бы ў сабе патэнцыяльную небяспеку: можа здарыцца не толькі пажар, але і выбух.

Над праблемай «Аўтамабіль і вадарод» працуюць вучоныя ў многіх інстытутах і лабараторыях краіны. Іх дзейнасцю кіруе спецыяльная камісія Акадэміі навук. Прапаноўваецца найбольш рацыянальны спосаб захоўвання вадароду «на борце» аўтамабіля — ён звязаны з выкарыстаннем гідрыдаў некоторых металаў. Канструкцыя «бакаў» для захоўвання вадароду нескладаная. Яна ўяўляе сабой набор трубак, запоўненых сплавам тытан — жалеза, якія змешчаны ў герметычны кажух. Да трубак ідуць два патрубкі, адзін для падачы вадароду пры запраўцы, другі для адводу яго да рухавіка. Двума патрубкамі аснашчаны і кажух: адзін з іх падключаецца да водаправода для ахаладжэння «бака» пры запраўцы, а па другім у час руху падаюцца гарачыя выхлапныя газы, якія прымушаюць сплаў аддаваць вадарод. Выпрабаванні машын з такімі «бакамі» паказалі, што на вадародным гаручым могуць працаваць самыя звычайныя аўтамабільныя рухавікі.

Тут можа ўзнікнуць пытанне: калі захоўваць запасы вадароду так складана, ці не прасцей атрымліваць яго на аўтамабілі? Вучоныя працуюць і над гэтым пытаннем, у аснове якога — хімічнае раскладанне вады на вадарод і кісларод. На дапамогу працэсам раскладання вады могуць прыйсці энергаакумулюючыя рэчывы (ЭАР).

Па сваёй сутнасці ЭАР — гэта сплавы з крэмнію, алюмінію, магнію і іншых рэчываў. Вобразна кажучы, ЭАР у самой сваёй структуры нясуць запас энергіі, якая траціцца на тое, каб выцесніць з негаручай вады эфектыўнае гаручае — вадарод.

Словам, аўтамабіль, які працуе на вадзе,— ніякая не фантастыка... А пакуль у бензінавага рухавіка няма рэальнага канкурэнта. Але рана ці позна ён абавязкова з'явіцца: планеце, усім нам чыстае паветра патрэбна, як... паветра!





## Вучыся бачыць сны

«Вучыцеся бачыць сны, джэнтльмены»,— пісаў вядомы нямецкі хімік Ф. Кекуле. Ён зрабіў выдатнае адкрыццё — устанавіў структурную формулу бензолу. Вучоны расказваў, што гэта ідэя, якая мела для арганічнай хіміі кардынальнае значэнне, прыйшла яму ў галаву ў час... сну.

Давайце паспрабуем разабрацца ў гэтым. Наш мозг нярэдка працягвае ноччу работу, пачатую днём. Для творчых работнікаў пяро і запісная кніжка на тумбачцы ля ложка — прадметы зусім не лішнія. Начную работу мозга ў час сну трэба браць на ўзбраенне. Хто ведае, а ці не была ідэя дывана-самалёта або транспартнага памяла для нейкай сеньёры з доміка на курыных ножках падказана казачніку ў час сну!

У свеце сноў усё магчыма. Тое, што ўвачавідкі ніколі не прыйшло б у галаву, тое, што мы абверглі б, ні на мінуту не задумваючыся, як неверагоднае,— у час сну прымаецца як належнае. Між тым тое, што ў першую мінуту здалося зусім намагчымым, пасля абдумвання можа здацца не такім ужо безразважным.

На жаль, вельмі мала людзей умеюць карыстацца дарам бачыць сны. Нямала людзей сцвярджаюць, што ўвогуле не бачаць сноў. Гэта памылковая думка. Усе здаровыя людзі рэгулярна бачаць сны, але, прачнуўшыся раніцай, іх не памятаюць. Добра памятаюць сны людзі, якія спяць неглыбока. Магчымасць своечасова прачнуцца або запомніць сон звязана з вартавымі пунктамі. Яны могуць узнікнуць у чалавека, захопленага сваёй работай. Зрабіць навуковае адкрыццё ў час сну здольны толькі чалавек, які застаецца вучоным усе 24 гадзіны ў суткі — і на рабоце, і дома. У гэтым сэнсе аб уменні бачыць сны і пісаў вялікі хімік Ф. Кекуле.

Спяшаюся суцешыць хлопчыкаў і дзяўчынак, якія «не ўмеюць» бачыць сны: выкананая мозгам за ноч работа не прападае дарэмна, нават калі аб ёй не засталося ўспамінаў. Некаторыя вучоныя лічаць, што сэнс сну не ў ажыццяўленні асобных біяхімічных рэакцый, звязаных з аднаўленнем клетак мозга, а ў патрэбе бачыць сны. Савецкія псіхолагі звярнулі ўвагу на тое, што ў чалавека, які спіць, раптам узнікаюць хуткія рухі вочных яблыкаў. Менавіта ў гэтыя моманты яму сняцца сны.

Звычайны сон праходзіць некалькі этапаў. Санлівасць (А) змяняецца стадыяй лёгкай дрымоты (В), потым неглыбокага сну (С). На працягу наступных (Д) і (Е) сон чалавека паглыбляецца і ўзнікае апошні перыяд «хуткіх рухаў» вачэй. У гэты ж час адбываецца затрымка дыхання, арытмія пульса і ўзнікаюць рухальныя рэакцыі, а чалавек працягвае спаць. Сон у гэты момант вельмі моцны. Стадыю хуткіх рухаў вачэй называюць парадаксальнай.

Працягласць кожнай стадыі залежыць ад многіх прычын. У нармальнага чалавека найбольш працяглая стадыя (С). На яе прыходзіцца больш палавіны сну. Другое месца займае парадаксальная стадыя, а самай кароткай з'яўляецца стадыя Д. На працягу ночы кожная стадыя ўзнікае па некалькі разоў.

Працягласць кожнай стадыі з узростам мяняецца. У маленькіх дзяцей увесь цыкл стадый заканчваецца за 50—60 мінут. Стадыя Е, пачынаючы з паўналецця, паступова скарачаецца і к канцу жыцця змяншаецца ў два



разы. Спаць парадаксальна ўмеюць галубы, куры, галкі, мышы, пацукі, трусы, авечкі, кошкі, сабакі, малпы — гэта значыць, вышэйшыя жывёлы. Ніжэйшым гэта не дадзена. Ні рыбы, ні жабы спаць парадаксальна не ўмеюць.

Ці бачаць сны жывёлы? Сказаць цяжка, аб гэтым нават папугая не спытаеш. Ёсць думкі вучоных, што ўсе жывёлы бачаць сны. Але гэта гіпотэза. Між тым, у сабакі ў час сну ўздрыгваюць лапы. Часам у сне ён паскугольвае то жаласліва, то радасна, а часам скавыча або нават гыркае.

Парушыць сон няцяжка, напрыклад, голадам. У першыя два дні галадання павялічваецца стадыя парадаксальнага сну. Потым ён змяншаецца, на восьмы дзень поўнасцю знікае. Пасля знікае павольны сон. Пакуль у жывёлы захоўваецца апетыт, яе яшчэ можна выратаваць. Адразу ж пасля ежы аднаўляецца здольнасць спаць.

Парадаксальны сон вывучаецца ў многіх лабараторыя свету, але па-ранейшаму незразумела, навошта спатрэбіўся мозгу начны кінематограф. Магчыма, асноўная задача парадаксальнай стадыі — паказаць нам сны? Адно несумненна: умець глядзець сны — карысна. Спаць парадаксальна варта!






## ПАРАДЫ ДАМАВІЧКА

* * *

Я пакажу, як зрабіць гульні-галаваломкі, што зацікаваяць дзяцей усіх узростаў. Гульні трэба начарціць на кардоне і выразаць.

Гульня КІТАЙСКАЯ ГАЛАВАЛОМКА расчэрчана ў квадраце. З сямі частак галаваломкі можна скласці вялікую колькасць фігур. Прытрымлівайся правіла: у фігуру павінны ўвайсці часткі, што знаходзяцца побач, але не прыкрываюць адна другую. Два камплекты такой гульні даюць яшчэ большую колькасць фігур. Складваючы фігуры, можна паварочваць часткі галаваломкі любым бокам, таму пажадана, каб яны былі аднолькавага колеру. У гульню цікава гуляць удвух ці ўтрох. Кожны павінен мець свой камплект гульні. Выйграе той, хто прыдумае больш фігур. А для таго каб іх запомніць, контуры фігур абводзяць на паперы.





АРХІМЕДАВА ГУЛЬНЯ нагадвае папярэднюю, але складаецца з чатырнаццаці частак і патрабуе больш складаных рашэнняў. Лічыцца, што гульня прыдумана славутым грэчаскім матэматыкам Архімедам. Даўжыня прамавугольніка ў гэтай гульні ў два разы большая за шырыню. Пунктыр дадзены, каб аблегчыць разметку чарцяжу, а разрэзаць кардон трэба па суцэльнай лініі. Правілы тыя ж, што і ў кітайскай галаваломцы.





Яшчэ адна гульня — варыянт папярэдніх — КАЛУМБАВА ЯЙКА. Тут дзевяць частак і тыя ж правілы.




* * *

Для афармлення свята ў піянерскім лагеры можна зрабіць ПАПЯРОВЫХ ПТУШАК. Склаўшы тоўсты аркуш паперы ўдвая, павяліч па клетках выкрайку, калі не зможаш намаляваць птушку самастойна. Потым склейваецца ніжняя частка развароту. Верхняя — адгінаецца.

Птушак развешваюць на галінках дрэў. А пасля свята дораць малым, якія вельмі радуюцца, запускаючы іх.




* * *

ЛЕТНЯЯ СУМКА — занятак для цярплівых і акуратных. Хутка яе не зробіш. Працаваць можна не спяшаючыся, вечарамі, каля радыё ці тэлевізара. Спачатку трэба выразаць 72 кардонных кольцы (дыяметр — 5 сантыметраў) і абплесці іх пяцельным швом махнатай ніткай. Потым кроіцца палатняная падкладка і нашываюцца кольцы, што папярэдне раскладваюцца, каб змераць ніжнюю частку і бакі сумкі.



* * *

Неабходная рэч у гаспадарцы — фартух. Яго сшыюць з ільнянога ручніка (пажадана, каб тканіна была прыгожая!) нават тыя, хто толькі вучыцца валодаць іголкай. Прыкінь на сябе ручнік — падыходзіць даўжыня і шырыня? Цяпер трэба падвярнуць верхнія вуглы, замацаваць іх з адваротнага боку і прышыць тры тасёмкі. Калі ёсць (няхай невялікі!) швацкі вопыт, паспрабуй скроіць фартух са старой сукенкі, сарафанчыка, спадніцы. Упрыгож яго карункамі, стужкамі, тасёмкай. Прыгожы фартух, калі скамбінаваны з двух розных па колеру і малюнку тканін з аборкамі.

* * *

Цяжка выкарыстаць парады з кулінарных кніжак, калі няма хатніх вагаў. Колькасць прадуктаў там дадзена ў грамах. Гэта табліца дапаможа табе ўзважваць... без вагаў.

Колькасць узважваемых прадуктаў дадзена ў грамах.



| НАЗВА ПРАДУКТА | ТОНКАЯ ШКЛЯНКА | СТАЛОВАЯ ЛЫЖКА | ЧАЙНАЯ ЛЫЖКА |
|---|---|---|---|
| МУКА | 160 | 25 | 10 |
| КРУХМАЛ | 200 | 30 | 10 |
| МАННЫЯ КРУПЫ | 200 | 25 | 8 |
| РЫС | 230 | 25 | 9 |
| ЦУКРОВЫ ПЯСОК | 200 | 25 | 10 |
| МАЛАКО | 250 | 20 | 5 |
| МАЛАКО ЗГУШЧАНАЕ | - - | 30 | 12 |
| СМЯТАНА | 250 | 25 | 10 |
| ТАМАТНАЯ ПАСТА | - - | 44 | 20 |

Адна сярэдняя морква важыць каля 75 г., сярэдні агурок — 100 г., пятрушка — 50 г.

* * *

Што прасцей за ўсё прыгатаваць да чаю? Вядома, БУТЭРБРОД. Намазаць хлеб маслам і пакласці на яго скрылёк сыру ці каўбасы. А калі паглядзець на прыгатаванне бутэрбродаў, як на кухарскае майстэрства? Магчымасці для творчасці тут цудоўныя. Можна нават прыняць гасцей, заварыўшы чай і зрабіўшы «бутэрбродны стол».

Не нарэзвай хлеб тоўстымі лустамі. Іх таўшчыня — 1 — 1,5 сантыметры. Батон нарэж фігуркамі: прамавугольнікамі, трохвугольнікамі, ромбамі, кружочкамі, кветкамі. На скрылёк каўбасы пакладзі кружок крутога яйка, памідор, трошкі пятрушкі ці пёрка зялёнай цыбулі. Прыкрываюць каўбасу і лістом зялёнай салаты, а зверху капаюць крыху маянэзу.

Для бутэрброда падыдзе не толькі каўбаса, вяндліна, але і варанае мяса, курыца. Упрыгожыць бутэрброд і па-

лепшыць смак кружок салёнага ці свежага агурка, радысу. Хлеб, масла, салёная рыба і памідор добра спалучаюцца.

Бутэрброд з тварагом гаспадыні пасыпаюць цукровым пяском альбо соллю з перцам, з часнаком. Паспрабуй намазаць лусту хлеба маслам, пакласці на яго кружок яблыка з выразанай сярэдзінкай, а ў яе накапаць невялікую колькасць варэння.

Бываюць слаёныя бутэрброды. Адрэж тры лустачкі хлеба (лепш перад прыгатаваннем іх злёгку абжарыць), прамаж маслам ці маянэзам і начыні кожны слой прадуктамі, якія сумяшчаюцца.

Рабіць бутэрброд трэба перад ежай, а калі чакаеш гасцей — перад іх прыходам.

* * *

Нельга класці разам белы і чорны хлеб, бо белы пры гэтым губляе смак.

* * *

Заварваць чай трэба ў фарфоравым ці ў фаянсавым чайніку, папярэдне спаласнуўшы яго крутым варам. Пасля гэтага ўсыпаць 1—2 чайныя лыжкі сухога чаю, заварыць крутым варам (на адну трэцюю частку чайніка), накрыць сурвэткай і праз 5—7 хвілін даліць варам даверху.

* * *

Нельга, каб кава кіпела: знікне смак і пах. А калі ж яна закіпела, трэба тэрмінова зняць кафейнік з агню і дабавіць у яго некалькі кропель халоднай вады.



* * *

Каб булён быў празрыстым, трэба, прамыўшы мяса, паставіць яго спачатку на моцны агонь. Як толькі булён закіпіць, знімаюць пену, робяць маленькі агонь і вараць да гатоўнасці.

* * *

Саліць мясны булён трэба за паўгадзіны да гатоўнасці, рыбны — у пачатку, грыбны — у канцы гатавання.

* * *

Празрысты мясны булён набывае асабліва прыемны смак, калі пры гатаванні пакласці ў яго кавалак сухога сыру.

* * *

Рыс не разварыцца, калі ў вар падліць некалькі лыжак халоднага малака.

* * *

З некаторых сартоў вэнджаных каўбас цяжка зняць скурку. Калі пакласці каўбасу на паўхвіліны ў халодную ваду, скурка лёгка знімаецца.

* * *

Пры прыгатаванні ежы не кідайце прадукты ў вар, а залівайце варам. Інакш можна ашпарыцца.

* * *

Гарачыя стравы падаюць да стала ў падагрэтых талерках, а халодныя — у ахалоджаных. Гэта захоўвае іх смак.

* * *

Учарашнюю кашу выкідаць не варта. Дадаўшы да кашы з любых круп яйка, пітную соду, муку, можна выпечы смачныя аладкі.

* * *

Абсмажваючы мяса, курыцу, шніцэль, лепш выкарыстаць масла з дабаўленнем у яго лыжкі алею. Так масла не будзе прыгараць, а алей страціць спецыфічны прысмак.

* * *

Калі малако адкіпела, яго можна яшчэ выкарыстаць. Адцісніце яго праз марлю, і атрымаецца вельмі смачны тваражок, а на сыроватцы можна прыгатаваць аладкі.

* * *

Посуд, у якім падгарэла малако, лёгка адмываецца, калі ў яго наліць халоднай вады, дабавіць адну-дзве сталовыя лыжкі пітной соды і кіпяціць дзве-тры мінуты.

* * *

Патэльню, на якой смажылі рыбу, спачатку трэба працерці паперай з соллю. Пасля гэтага памыць мыльным растворам.

* * *

Мясарубку лягчэй мыць, калі пасля мяса прапусціць праз яе цыбулю і кавалак хлеба.



* * *

Калі ў шафах і скрынках з'явіўся непрыемны пах, трэба працерці іх анучкай, змочанай у растворы: на літр вады 1 чайную лыжку марганцоўкі.

* * *

Калі рэжаце гуму, змазвайце нож мылам: рэзаць будзе лягчэй і край атрымаецца роўным.

* * *

Трэшчыну ў аконным шкле можна пакрыць тонкім слоем бясколернага лаку. Тонкая, празрыстая плеўка трымаецца два-тры гады, не змываецца. Наносіць лак лепш са знешняга боку.

* * *

Перш чым фарбаваць аконныя рамы маслянай фарбай, шкло змажце воцатам, тады фарба да яго не прыстане. І іншы спосаб: прыклейце мылам да шкла ўздоўж аконнай рамы папяровую палоску шырынёй 5 см.



## ЗМЕСТ

*Міхась Чарняўскі*
**СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ**
Неўры, гуты, балты, славяне — 3

*Дзмітрый Новікаў*
**ІНШАПЛАНЕЦЯНЕ**
НЛА у Беларусі — 12
Прывітанне, «зялёныя чалавечкі»! — 22
Гронка гіпотэз — 27
Замест эпілога — 34

*Міхась Лібінтаў*
**ПОШУКІ. АДКРЫЦЦІ. ЗНАХОДКІ**
Назвалі прыбор... тэрмометрам — 36
Сакрэт чароўных шкельцаў — 38
Гаручае — вада? — 40
Вучыся бачыць сны — 43

**ПАРАДЫ ДАМАВІЧКА** — 46

---

Научно-популярное издание
*Составитель Филипович Наталия Васильевна*

**ЭВРИКА**

**Очерки**

Минск, издательство «Юнацтва»
На белорусском языке

Навукова-папулярнае выданне
Укладальнік *Філіповіч Наталія Васільеўна*

**ЭЎРЫКА**

**Нарысы**

Рэдактар *Н. В. Філіповіч.* Мастацкі рэдактар *У. М. Жук.*
Тэхнічны рэдактар *А. В. Русецкая.* Карэктар *Л. К. Паплаўская*

ІБ № 1673

Здадзена ў набор 08.04.92. Падпісана да друку 11.12.92. Фармат 70×90 1/16. Папера афс. Гарнітура Кудрашэўская энцыклапедычная. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 4,09. Ум. фарб.-адб. 17,24. Ул.-выд. арк. 2,84. Тыраж 28 000 экз. Зак. 270.

Выдавецтва «Юнацтва» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінская фабрыка каляровага друку. 220115, Мінск, Каржанеўскага, 20. Дыяпазітывы тэксту падрыхтаваны Мінскім ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінатам МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.



МІНСК «ЮНАЦТВА»



